# ІНТАРЭСЫ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ Ў ЛАЦІНААМЕРЫКАНСКІМ РЭГІЁНЕ (2000–2010 гг.)

С.Ф. Свілас, К.А. Місюкевіч (Мінск)

Прыход да ўлады левых сіл у пачатку новага стагоддзя радыкальна змяніў аблічча лацінаамерыканскіх краін на сусветнай арэне, абумовіў з'яўленне новых знешнепалітычных прыярытэтаў, якія заставаліся з большасцю дзяржаў Лацінскай Амерыкі да канца дзесяцігоддзя. У XXI ст. краіны Лацінскай Амерыкі ўступілі з імкненнем актывізаваць адносіны не толькі ўнутры рэгіёна, але і з краінамі на ўсіх кантынентах. Крокі, рэалізаваныя ў гэтым напрамку, сведчылі аб тым, што рэгіён імкнуўся стаць адным з важнейшых гульцоў новага, поліцэнтрычнага светапарадку [11, с. 55]. Новыя магчымасці супрацоўніцтва лацінаамерыканскія краіны бачылі ў развіцці адносін з Расійскай Федэрацыяй. У першым дзесяцігоддзі XXI ст. яе знешнепалітычны курс быў накіраваны на ўпарадкаванне сувязяў з найбольш уплывовымі і актыўнымі дзяржавамі, якія пакуль што знаходзяцца на стадыі развіцця. Вялікая колькасць такіх дзяржаў якраз сканцэнтравана ў Лацінскай Амерыцы. Новыя знешнепалітычныя прыярытэты, што ўзніклі ў выніку «левага павароту», заставаліся з большасцю дзяржаў Лацінскай Амерыкі да канца дзесяцігоддзя, калі ў рэгіёне назіралася масавая параза левых сіл на прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах.

На пачатку 1990-х гг., пасля распаду СССР і выхаду на міжнародную арэну яго пераемніцы – Расійскай Федэрацыі, ва ўмовах яе канстытуцыйна замацаванага адыходу ад ідэалагізацыі знешняй палітыкі, супрацоўніцтва з рэгіёнам належным чынам не развівалася. Галоўны знешнепалітычны акцэнт таго часу быў зроблены на аднаўленне добрых адносін з заходнімі дзяржавамі, якія яшчэ зусім нядаўна лічыліся ідэалагічнымі ворагамі. Да гэтага часу савецкае кіраўніцтва інтэнсіўна развівала адносіны толькі з сацыялістычнай Кубай, нягледзячы на тое, што дыпламатычныя адносіны з іншымі дзяржавамі рэгіёна таксама былі ўсталяваныя. У паўднёвую частку рэгіёна, дзе знаходзяцца такія эканамічныя «гіганты» Лацінскай Амерыкі, як Аргенціна, Бразілія і Уругвай, першы афіцыйны візіт дэлегацыі СССР быў нанесены ўжо на сконе савецкіх часоў, падчас «перабудовы» ў 1987 г. [5, с. 7].

На заранку свайго існавання Расійская Федэрацыя здолела пабудаваць падмурак для далейшага супрацоўніцтва з краінамі Лацінскай Амерыкі, а пачалося гэта з фармавання дагаворна-прававой базы адносін [10, с. 42]. Вялікую ролю ў гэтым фармаванні адыграла асоба Яўгена Прымакова – расійскага міністра замежных спраў, які з'яўляўся прыхільнікам канцэпцыі поліцэнтрычнага светапарадку і лічыў, што «краіны трэцяга свету» павінныя стаць паўнапраўнымі актарамі міжнародных адносін. У яго канцэпцыю добра ўпісвалася і Лацінская Амерыка [6]. У канцы 1990-х гг. Я. Прымакоў наведаў з афіцыйным візітам 7 лацінаамерыканскіх краін – Аргенціну, Бразілію, Венесуэлу, Калумбію, Коста-Рыку, Кубу і Мексіку, у выніку чаго быў падпісаны шэраг дамоў аб супрацоўніцтве [1, с. 385]. Трэба браць да ўвагі і тое, што падзеі на

пачатку стагоддзя непасрэдна ў самой Лацінскай Амерыцы абумовілі зацікаўленасць краін рэгіёна супрацоўніцтвам з Расіяй і прымусілі ўзгадаць сяброўскія сувязі, гісторыя якіх налічвае больш за два стагоддзі [7]. Лацінаамерыканскія краіны падтрымалі дыялог на двухбаковым і шматбаковым узроўнях, што мела вялікае значэнне для паглыблення супрацоўніцтва Расіі з МЕРКАСУРам – буйнейшым паўднёваамерыканскім эканамічным блокам, а таксама з Лацінаамерыканскай асацыяцыяй інтэграцыі і Андскай супольнасцю.

Пасля ўступлення на пост прэзідэнта Уладзіміра Пуціна ў 2000 г. знешняя палітыка Расіі ў лацінаамерыканскім рэгіёне яшчэ больш заўважна актывізавалася. Усяго толькі за першы год прэзідэнцтва Ул. Пуцін сустрэўся з лідарамі Венесуэлы і Мексікі (у рамках «Саміта тысячагоддзя» ААН), з прэзідэнтам Чылі Р. Лагасам на форуме АТЭС у Брунэі, а ў канцы года з афіцыйным візітам наведаў Кубу [6, с. 150].

У сакавіку 2003 г. Уладзімір Пуцін прыняў у Крамлі прадстаўнікоў групы Рыа, механізму палітычных кансультацый для пагадження агульных лацінаамерыканскіх пазіцый, якая ў 1999 г. не проста асудзіла бамбардыроўкі Югаславіі, але і адзначыла канкрэтныя артыкулы Статута ААН, парушаныя краінамі НАТА. Ул. Пуцін падкрэсліў, што кантакты з групай Рыа трэба пашыраць, праводзячы больш сустрэчаў у Расіі [1, с. 385].

У 2000 г. была прынята Канцэпцыя знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, якая вызначыла знешнепалітычныя асновы Расіі, ў тым ліку і да лацінаамерыканскага рэгіёна. Пасярод прыярытэтных накірункаў знешнепалітычнай стратэгіі Расіі ў Лацінскай Амерыцы былі адзначаныя заахвочванне экспарта расійскай навукаёмкай прамысловай прадукцыі, развіццё ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і кааперацыі, пашырэнне ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях, а таксама рост палітычнага дыялога і эканамічнага супрацоўніцтва [2].

Задачы заахвочвання экспарта расійскай навукаёмкай прамысловай прадукцыі, гэтага асноўнага драйвера развіцця міжнароднага гандлю ў новым стагоддзі, адпавядае выхад на супрацоўніцтва ў высокатэхналагічных адгалінаваннях, што стала магчымым дзякуючы заключэнні міжурадавых пагадненняў аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з Мексікай (1996), Бразіліяй і Аргенцінай (1997). Найбольш перспектыўныя сумесныя даследванні кранаюць такія сферы, як атамная энергетыка, даследванне космасу і ахова здароўя. Аднак, нягледзячы на наяўнасць розных пратаколаў, мемарандумаў і пагадненняў, на практыцы яны не паўплывалі на аб’ёмы паставак расійскай навукова-тэхнічнай прадукцыі ў краіны рэгіёна. У якасці прычын варта вылучыць агульную абмежаванасць расійскай інавацыйнай сістэмы і наяўнасць у Расіі канкурэнтных перавагаў толькі на асобных рынках. Таксама цяжкасцяў дадавала і недастатковае фінансаванне навукі і тэхнікі ў непасрэдна лацінаамерыканскіх дзяржавах, што і тлумачыць нізкі попыт на расійскую навукаёмкую прадукцыю [9].

У развіцці з краінамі Лацінскай Амерыкі палітычнага дыялогу, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і кааперацыі Расійская Федэрацыя здолела дасягнуць значных поспехаў. Перш за ўсё, гэта было абумоўлена агульнымі

падыходамі да будаўніцтва новага светапарадку і агульным канкурэнтам – ЗША. Таму найбольш шчыльнага супрацоўніцтва ў гэтай сферы Расія дасягнула з Венесуэлай, якая сутыкнулася з аб'яўленнем эмбарга з боку ЗША на замену састарэлай венесуэльскай ваеннай тэхнікі амерыканскай вытворчасці. Венесуэла ажыццявіла маштабныя закупкі расійскай ваеннай тэхнікі: самалётаў, верталётаў, танкаў, стралковай зброі, а таксама процілаветраных ракетных комплексаў [1, с. 387].

Ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Расіі ажыццяўлася і з іншымі дзяржавамі рэгіёна, перадусім, з тымі, якія найбольш поўна адчулі на сябе ўплыў «левага павароту» і з'яўляліся аднадумцамі ў імкненні паслабіць пазіцыі ЗША у рэгіёне. Так, адным з буйнейшых пакупнікаў расійскай ваеннай тэхнікі пасля Венесуэлы апынулася Куба. У меншых маштабах тэхніку закупалі такія краіны, як Балівія, Бразілія, Калумбія і Эквадор [1, с. 388].

Агульныя пазіцыі Расіі і лацінаамерыканскіх краін па выбудоўванні новага, поліцэнтрычнага светаўпарадкавання знайшлі сваё адлюстраванне ў падтрымцы адзін аднаго ў дзейнасці міжнародных арганізацый. Лацінаамерыканскія краіны падтрымалі ўступленне Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, а Расія выказвалася ў падтрымку кандыдатуры Бразіліі на месца пастаяннага члена Савета Бяспекі ААН [8, с. 354]. Варта адзначыць і тое, што як Расія, так і краіны Лацінскай Амерыкі дэкламавалі імкненне да ўмацавання цэнтральнай ролі ААН у свеце і актыўна адстойвалі прынцып неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў, выступаючы ў міжнародных арганізацыях як процівага інтарэсам ЗША.

Наступны прыярытэтны накірунак знешняй палітыкі Расіі ў Лацінскай Амерыцы, а менавіта шчыльнае эканамічнае супрацоўніцтва, набыў ўстойлівы характар дзякуючы станоўчым зрухам у эканоміцы многіх краін рэгіёна, якія здолелі пераадолець цяжкія эканамічныя наступствы неаліберальных эксперыментаў. У цэлым, ажыцяўленні інтарэсаў на гэтым напрамку спрыяла і тое, што эканомікі Расіі і большасці краін рэгіёна, у цэлым, узаемадапалняльныя [3, с. 57]. Лацінаамерыканскі рэгіён і Расію збліжае і падабенства падыходаў да нормаў міжнароднага гандлю і рэфармавання сусветнай фінансавай сістэмы [4, с. 144].

Аднак казаць пра паўнавартасную рэалізацыю эканамічных і гандлёвых магчымасцяў Расіі ў рэгіёне было б памылкова, бо для гэтага ў маладой дзяржавы меўся шэраг перашкодаў: геаграфічная аддаленасць, узаемнае недастатковае веданне магчымасцяў рынкаў, адсутнасць новых формаў гандлю, справавай ініцыятывы і эфектыўнага фінансавага механізму, згодна з якім магчыма праводзіць аперацыі. Таксама і асартымент расійскіх паставак у рэгіён быў даволі вузкім. Але меліся і станоўчыя тэндэнцыі, пасярод якіх – стварэнне сумесных прадпрыемстваў, звязаных з разведкай нафтавых месцазнаходжанняў (напрыклад, з Калумбіяй) і аўтамабільнай прамысловасцю (сумесная зборка аўтамабіляў ВАЗ з Калумбіяй, Эквадорам і Уругваем). Таксама ў рэгіёне дзейнічалі такія расійскія кампаніі, як «Лукойл», «Раснафта», «Газпрам» і «Альфа-Эка», што кажа аб інтарэсах да рэгіёна расійскага прыватнага капіталу [6, с. 151].

Такім чынам, на пачатку новага стагоддзя лацінаамерыканскі рэгіён апынуўся важнай складнай часткай ў структуры расійскіх знешнепалітычных сувязяў; адбылося станаўленне цэласнай сістэмы расійска-лацінаамерыканскіх адносін, усе кампаненты якой – ад стратэгічнага да гандлёва-эканамічнага – заўважна актывізаваліся. Пасярод расійскіх знешнепалітычных асноваў у адносінах да рэгіёна Лацінскай Амерыкі, якія выцякаюць з прынятай у 2000 г. Канцэпцыі знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, найбольш паспяхова былі рэалізаваныя ваенна-тэхнічны напрамак і супрацоўніцтва ў рамках міжнародных арганізацый. Гэта кажа аб тым, што Расія разглядае супрацоўніцтва з краінамі Лацінскай Амерыкі, у першую чаргу, з пазіцый геапалітычнай выгады. Паспяховаму ажыццяўленню ў лацінаамерыканскім рэгіёне расійскіх інтарэсаў спрыяе як зніжэнне прысутнасці ў ім ЗША, так і супадзенне пазіцый Расіі і краін Лацінскай Амерыкі па ключавых пытаннях сусветнай палітыкі, якія сталі відавочнымі са зменамі знешнепалітычных курсаў.

*Крыніцы і літаратура:*

1. Внешняя политика России. 1991–2016 : кол. монография / Т.А. Шаклеина [и др.] ; отв. ред. Е.М. Кожокин, А.Л.Чечевишников ; под общ. ред. и с предисл. акад. А.В. Торкунова. – М. : МГИМО-Университет, 2017. – 538 с.
2. Концепция внешней политики Российской Федерации от 28 июня 2000 г. [Электронный ресурс] // Гарант. – Режим доступа: https://base.garant.ru/2560651/. – Дата доступа: 08.03.2022.
3. Массарова, А.Р. Латинская Америка и Россия: эволюция взаимных внешнеэкономических интересов (1995–2011 гг.) / А.Р. Массарова // Вестник Российского университета дружбы народов. Серия: Экономика. – 2013. – №1. – С. 51–59.
4. Нуньес-Саранцева, Н.Н. Торгово-экономические отношения МЕРКОСУРа с внезональными партнёрами / Н.Н. Нуньес-Саранцева // Власть. – 2012. – № 8. – С. 141–145.
5. Пятаков, А.Н. Россия – Латинская Америка в XXI веке: трудности и противоречия сближения [Электронный ресурс] / А. Н. Пятаков // Russie.Nei.Visions. – 2020. – № 119. – Режим доступа: https://www.ifri.org/sites/default/files/atoms/files/pyatakov_russia_latin_america_ru_2020.pdf. – Дата доступу: 02.03.2022.
6. Сизоненко, А.И. Россия – Латинская Америка: новый этап отношений / А.И. Сизоненко // Россия и современный мир. – 2004. – № 1. – С. 148–152.
7. Сизоненко, А.И. Российско-латиноамериканские отношения: истоки и традиции [Электронный ресурс] / А.И. Сизоненко // Международная жизнь. – 2013. – № 4. – Режим доступа: https://interaffairs.ru/jauthor/material/850. – Дата доступа: 14.03.2022.
8. Современные международные отношения : учебник / под ред. А.В. Торкунова, А.В. Мальгина ; МГИМО (У) МИД России. – М. : Аспект-Пресс, 2012. – 688 с.
9. Школяр, Н.А. Россия – Латинская Америка: перспективы научно-технического сотрудничества [Электронный ресурс] / Н.А. Школяр // Российский совет по международным делам. – Режим доступа: https://russiancouncil.ru/analytics-and-comments/analytics/rossiya-latinskaya-amerika-perspektivy-nauchno-tekhnicheskogo-sotrudnichestva/. – Дата доступа: 16.03.2022.
10. Щетинин, А.В. Латинская Америка – неизменно важное направление внешней политики России / А.В. Щетинин // Латинская Америка. – 2019. – № 7. – С. 40–47.
11. Яковлев, П.П. Геополитический разворот стран Латинской Америки / П.П. Яковлев // Мировая экономика и международные отношения. – 2014. – № 7. – С. 55–65.